Нядзеля Спаслання Святога Духа

Аўтар: кс. Ян Раманоўскі
04.06.2017 00:00



З Евангелля св. Яна

Калі быў вечар таго першага дня тыдня, і дзверы дома, дзе збіраліся вучні, былі замкнёныя ад страху перад юдэямі, прыйшоў Езус і стаў пасярэдзіне, і сказаў ім: “Спакой вам!”. І, сказаўшы гэта, паказаў ім рукі і бок. Узрадаваліся вучні, убачыўшы Пана. Тады Езус зноў сказаў ім: “Спакой вам! Як паслаў Мяне Айцец, так і Я пасылаю вас”. І, сказаўшы гэта, дыхнуў, і кажа: “Прыміце Духа Святога. Каму адпусціце грахі, таму будуць адпушчаны; на кім пакінеце, на тым застануцца”. † *Ян 20, 19–23*

Мы былі пасланыя

Дадзены фрагмент Евангелля гаворыць пра аб’яўленне Езуса сабраным вучням у дзень уваскрасення і пра даручаную ім місію: “Як паслаў Мяне Айцец, так і Я пасылаю вас”. Гэта яны, напоўненыя страхам пасля падзей Вялікай пятніцы, павінны былі стаць сведкамі змёртвыхпаўсталага Пана і абвяшчаць Яго навуку словам і жыццём. Аднак неабходна ўсведамляць, што тыя словы Хрыстос скіраваў не толькі Апосталам, але таксама кожнаму з нас – прынятых у Яго Касцёл праз хрост і ўмацаваных у веры праз сакрамант канфірмацыі, каб з моцай Святога Духа сведчыць пра ўваскрослага Пана ў сваім асяроддзі, сярод блізкіх, сяброў, знаёмых.

Перажываючы ўрачыстасць Спаслання Святога Духа, варта аднавіць у сабе той дух, каб зразумець і ўсвядоміць, што наша вера не можа абмяжоўвацца асвечанымі стравамі на Вялікдзень і аплаткай на Божае Нараджэнне. Быць хрысціянінам – гэта штосьці большае, чым перажыванне сваёй веры за зачыненымі дзвярамі.